## *Яго чакала Беларусь чатыры стагоддзі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў да 85-годдзя з дня нараджэння Міколы Ермаловіча. Успаміны, творы, фотаматэрыялы*, Менск 2007, сс. 360.

Дзіўным, калі не сказаць парадаксальным з'яўляецца ўзнікненне рэпрэзентуемай кнігі ў кантэксце развіцця сучаснай гістарычнай навукі Беларусі. І справа не ў тым, што **выйшла** такое выданне (да прыкрасці яно фігуруе на правах рукапісу, размножанага ў колькасці 150 асобнікаў), а перадусім у тым, што пад яго вокладкай сышліся як **аднадумцы** гуманітарыі з прынцыпова адрознымі поглядамі. Напрыклад, гісторыкі А. Трусаў і М. Сташкевіч, журналісты М. Гаравы („Народная воля") і Р. Ананьеў („Народная газета"). Да поўнага камплекту не хапае якога-небудзь Трашчанка ці хацяў б Новіка. Тым не менш, канешне, гэта не можа не цешыць. Аднак што сапраўды не цешыць, дык тое, што некаторыя з іх насамрэч працуюць не на гістарычную навуку, як рабіў М. Ермаловіч, а на ідэалогію, прыстасоўваючы тую навуку да патрэбаў палітыкаў.

Кніга, якая выйшла, так разумею, у серыі «Скрыжалі „Спадчыны"» (№ 5) утрымлівае некалькі раздзелаў. Яе мэта — стварэнне вобразу Міколы Ермаловіча не толькі як гісторыка (такім яго перадусім і ведае бальшыня), але і чалавека ў цэлым. Менавіта такім чынам дасягаецца, можна сказаць, манументальнасць гэтай постаці.

У першым раздзеле „Сведчанні пра Міколу Ермаловіча" падаюцца разнажанравыя публікацыі яго сяброў, аднадумцаў ды і звычайных знаёмых, якім у сілу сваёй дзейнасці давялося кантактаваць з аўтарам, вывучаць яго творы (менавіта вывучаць, бо для свайго часу працы М. Ермаловіча сталі ледзь не сенсацыйнымі адкрыццямі для ўсіх). Некаторыя з водгукаў ствараліся ў пачатку 1990-х (В. Іпатава), большасць — адмыслова для гэтага выдання. Падаюцца розныя аспекты жыцця і дзейнасці М. Ермаловіча: у кожнага з ім былі свае кропкі судакранання (хоць, зразумела, некаторых паўтарэнняў было не пазбегнуць). Найбольш цікавыя працы належаць пяру А. Белага і А. Валахановіча. Але і ў іншых аўтараў знаходзяцца каларытныя і эксклюзіўныя штрыхі да партрэта знакамітага гісторыка.

Безумоўна, дадаюць фарбаў лісты, выступы, прамовы самога М. Ермаловіча, сабраныя асобным раздзелам. На жаль, ён невялікі па памеры (с. 155-194). Думаецца, што такая спадчына не менш цікавая як даследчыкам, так і паспалітым аматарам гісторыі. Таму яе варта было б падаць у больш цэласным аб'ёме.

Шырыня кругагляду і шматграннасць таленту М. Ермаловіча напоў-

ніцу выяўляецца ў яго „гутарках" „Аб усім, што баліць" (с. 195-273). Гэта творы публіцыстычнай скіраванасці шырокага тэматычнага кола — ад праблем даўняй гісторыі да актуалій тых часоў, калі яны ствараліся і не маглі быць легальна рэпрэзентаваны, а распаўсюджваліся падпольна самвыдатам. „Гутаркі", якія адлюстроўваюць яшчэ адну змястоўную старонку пазацэнзурнага беларускага друку, друкуюцца ўпершыню.

Асобны раздзел, які па памеры склаў бы добры зборнік, адведзены пад вершы М. Ермаловіча (с. 275-315). Бальшыня іх прасякнута грамадзянскім пафасам. Але і тонкі лірызм многім паэтычным творам не чужы.

Заключная структурная частка кнігі прысвечана ўшанаванню памяці пра М. Ермаловіча — у слове, у фарбах, у бронзе, у камені, у фотадакументах (с. 317-350). І хаця даніна памяці пра яго велічную постаць не такая ўжо і сціплая, тым не менш імя аднаго з самых самавітых гісторыкаў Беларусі застаецца ў асяродку яе народа недастаткова знакамітым.

Такім чынам, М. Ермаловіч паўстае ў розных вобразах: як паэт, эсэіст, прамоўца, ды і проста як мужны чалавек, які не пабаяўся супрацьстаяць сістэме, якая не давала ніякай надзеі на перспектыўнасць здзяйсняемай ім працы.

Гэтае выданне засведчыла, што постаць М. Ермаловіча, яго дзейнасць патрабуе грунтоўнага вывучэння даследчыкаў мінулага. Ён не толькі вывучаў гісторыю, ён і рабіў яе. А ці сёння можна спадзявацца, што наступным выданнем пра М. Ермаловіча стане манаграфія пра яго жыццё і творчасць? На гэтае пытанне пакуль няма адназначнага адказу.

Напрыканцы застаецца падзякаваць фундатарам выдання (Анатолю Беламу, Надзеі Сармант, Ігару Голубеву, Станіславу Судніку, Людміле Собаль, Анатолю Валахановічу) за свой унёсак у справу ўвекавечвання постаці, знакавасць якой з цягам часу будзе толькі павялічвацца. І пашкадаваць, што на гэта не знайшлося грошай у кіраўнікоў дзяржавы, якая чакала такога чалавека чатыры стагоддзі.

**Анатоль Трафімчык**
(Вялікія Круговічы)